

***Прывітанне, мае сябры!***

***Вось і дачакаліся лістапада. За вокнамі пануе залатая восень. Каляндар прыроды напоўнены прыгожым надвор'ем, промнямі сонейка ды й шапатлівай моваю лістоты….***

***А што ж у літаратурным календары апошняга восеньскага месяца?***



***12 лістапада адзначым 100-годдзе Андрэя Макаёнка***

Андрэй Ягоравіч нарадзіўся 12 лістапада 1920 года ў вёсцы Борхаў Рагачоўскага раёна. Драматургічная спадчына Андрэя Макаёнка - залаты фонд беларускай літаратуры і тэатра. Ён творча развіў многія жанравыя традыцыі, падняў нацыянальную камедыю да ўзроўню лепшых узораў сусветнай камедыяграфіі. Значны ўклад унёс ён таксама ў развіццё беларускай гумарыстычнай прозы і публіцыстыкі.

Творчасць Андрэя Макаёнка -- самабытная з'ява ў беларускай літаратуры. Пісьменнік валодаў рэдкім талентам сатырыка-камедыёграфа і баявітым, наступальным характарам, што і абумовіла выключнасць, фенаменальнасць яго асобы.

Першая кніга Макаёнка выйшла ў 1951-м, а ў наступным годзе ён заявіў пра сябе як пра драматурга п'есай "На досвітку", якую паставілі на сцэне тэатра імя Янкі Купалы.

Камедыя "Выбачайце, калі ласка!" убачыла свет у 1953 годзе і мела неверагодны поспех. Нягледзячы на вострую сатыру, Макаёнак зусім не пасягнуў ёю на савецкі лад жыцця і існаваўшую ў той час сістэму, але крыніцы сцвярджаюць, што, калі б не смерць Сталіна, п'еса наўрад ці была бы пастаўлена.

Пасля трыўмфу сатырычнай камедыі Макаёнак пакінуў журналістыку і цалкам прысвяціў сябе літаратурнай дзейнасці. Толькі ў 1966-1978 гадах ён згадзіўся на пасаду галоўнага рэдактара "Нёмана", таму што яна дазваляла спрыяць папулярызацыі сучаснай беларускай літаратуры.

Неўзабаве з'явіліся наступныя яго творы: "Каб людзі не журыліся" (1957), "Лявоніха на арбіце" (1961), "Зацюканы апостал" (1969), "Таблетку пад язык" (1972), "Верачка" (1976) і іншыя. Акрамя п'ес Макаёнак пісаў сцэнарыі для фільмаў, а таксама займаўся перакладчыцкай дзейнасцю.

Пра шматграннасць таленту А. Макаёнка сведчаць яго кінааповесць "Твой хлеб", сцэнарыі фільмаў "Шчасце трэба берагчы", "Кандрат Крапіва", "Рагаты бастыён", тэлефільм "Пасля кірмашу", пераклады твораў савецкіх драматургаў на беларускую мову (Аляксандра Карнейчука, Леаніда Зорына і інш.), артыкулы па праблемах драматургіі, тэатра і кіно.

А колькі яшчэ было планаў і задумак….

На жаль, 16 лістапада 1982 года пісьменнік раптоўна пайшоў з жыцца ва ўзросце 62 гадоў і быў пахаваны на Усходніх могілках. У 1986 годзе ў Мінску на доме №10 па Вайсковым завулку яму была ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Драматург быў узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, "Знакам Пашаны", Кастрычніцкай Рэвалюцыі і шматлікімі медалямі, а таксама званнем "Народны пісьменнік БССР". Макаёнак з'яўляецца лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа.



**….У цэнтры эстонскага гарадкаКівіылі стаіць мемарыяльны знак у гонар беларускага пісьменніка Яна Скрыгана.** Гэта адзіны ў Эстоніі помнік беларускаму культурнаму дзеячу.

«Усё жыццё маё — як казка, толькі нядобрая, суровая. Як чужая», - так пісьменнік напісаў аб сваім жыцці.

Жыццё пісьменніка Яна Скрыгана сапраўды падобна на злую казку: двойчы рэпрэсаваны, ён цудам выжыў, страціў першую сям’ю. Пасля рэабілітацыі займаў высокія пасады, але іранічнасць стала вернай яго спадарожніцай….

Ян (Іван Аляксеевіч) Скрыган – пісьменнік, паэт, навеліст, нарысіст, публіцыст і крытык – нарадзіўся ў вёсцы Труханавічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у мясцовай царкоўнапрыходскай школе, потым вучыўся ў Слуцку ў Беларускай гімназіі і сельскагаспадарчым тэхнікуме. Сапраўдны пераварот у свядомасці юнака зрабілі кнігі Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі. Высокі прыклад служэння роднаму слову, народу паклікаў яго да літаратурнай працы.

Дэбютаваў Ян Скрыган вершамі ў 1925 г. Малады паэт падпісваўся незвычайнымі псеўданімамі: Пірат, Відук, Янка Відук. Пазней сам тлумачыў іх сэнс наступным чынам: «Пірат» нясе ў сабе разбуральна-рэвалюцыйную ідэю перамен, знішчэння ўсяго старога, «Відук» – сімвал неадольнага жыццесцвярджэння, так на Случчыне называюць дзікі мак-самасейку. Першыя паэтычныя спробы створаны пад уплывам вельмі прыкметнай фігуры ў літаратурным жыцці 20-х гадоў – Паўлюка Шукайлы (1904–1939), які быў гарачым прыхільнікам футурызму. Не адзін год аддаў Ян Скрыган марным намаганням засвоіць творчыя прынцыпы гэтага кірунку, пакуль не зразумеў, што гэта не яго дарога. Нейкі час захапляўся Байранам.

Творчы шлях Скрыгана-празаіка пачаўся з апавядання «Таіса» (1927) і аповесці «Затока ў бурах» (1929, дапрацоўвалася ў 1956 г.). Пераход да прозы быў не просты. Ад некаторых іншых маладнякоўцаў Ян Скрыган адрозніваўся арыентаванасцю на традыцыю, вострым адчуваннем мовы, любасцю да роднага слова, імкненнем вучыцца, а не вучыць.

Ян Скрыган — з таго самага пакалення беларускіх пісьменнікаў, якіх рэпрэсіўная машына калі не знішчыла, то скалечыла. Жыццё 19-гадовага хлопца, які толькі распачынаў свой творчы шлях, здавалася светлым і поўным надзей: праца ў друку, «Маладняк», такія ж юныя і апантаныя сябры-пісьменнікі, з якімі гадзінамі можна было размаўляць, дзяліцца ідэямі, спрачацца…

Усё перамяніў 1936 год, які назаўжды перакрэсліў яго мінулае жыццё, пакінуўшы ў ім мары, амаль усіх сяброў і маладую жонку Галіну, якая ўжо чакала дзіця.

13 лістапада 1936 г., калі пісьменнік знаходзіўся ў Доме творчасці пад Пухавічамі, уначы да яго пагрукалі: «Збірайцеся!» Затым — турма на Валадарскага (пісьменнік і вязень сталінскіх лагераў Сяргей Грахоўскі казаў, што ў той час на «Валадарцы» можна было адкрываць аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР), суд па 58-м артыкуле за «контррэвалюцыйную дзейнасць» і этап у Сібір на 10 гадоў.

Менавіта тут ў 1941 годзе да пісьменніка дайшлі скрушныя звесткі, што ў драўляны дом на Круглай плошчы ў Мінску (у раёне цяперашняга Дома літаратара), дзе жылі яго жонка, цешча і сын, трапіла бомба — і ўсе загінулі.

У 1946-м годзе пісьменніка вызвалілі, але на пяць гадоў пазбавілі права жыць у Беларусі. У Эстонію ён перабраўся да аднаго салагерніку - у горадКівіылі, каб быць бліжэй да Беларусі. Там уладкаваўся працаваць на сланцевахімічным камбінаце. Добрасумленнаму Яну Скрыгану

не адразу, але атрымалася навесці парадак на вытворчасці, і яго прызначылі галоўным бухгалтарам.

Пасля вызвалення ў 1946 годзе Яну Скрыгану, пазбаўленаму права вярнуцца ў Беларусь і жыць у буйных гарадах Савецкага Саюза, заставалася толькі ткнуць пальцам у мапу СССР. Ён так і зрабіў — і трапіў на Фергану ва Узбекскай ССР. Пэўна, чарговы раз здарыўся цуд, бо без грошай, ежы, губляючы прытомнасць на шляху, пісьменнік дабраўся да Ферганы, і там змог уладкавацца бухгалтарам на эвакуяваны з Масквы гідролізны завод.

Там ён сустрэў масквічку Ганну, муж якой загінуў, але застаўся маленькі сын Алік. Неўзабаве Ян і Ганна ажаніліся, і ў іх нарадзілася дачка, якую назвалі Галінай. Ганна з разуменнем паставілася да жадання мужа назваць дзяўчынку іменем яго першай жонкі.

Дзяржава і людзі пакрысе ачомваліся ад ваеннага ліхалецця. І тут Сталін згадаў, што «палітычныя», якіх не расстралялі ў 1930-х, выйшлі на волю — а гэта небяспечна. Па ўсім Саюзе пайшла другая хваля рэпрэсій. Праўда, гэтым разам не расстрэльвалі, а высылалі на вечнае пасяленне ў самыя дальнія куткі краіны.

Вось і наш герой 25 чэрвеня 1949 г ён быў паўторна арыштаваны і зноў адпраўлены ў сібірскую спасылку.

Верагодна, жонку таксама чакала высылка ў лагер і разлука з дзецьмі, але адзін спагадлівы супрацоўнік міліцыі папярэдзіў Ганну: у чацвер усё начальства з’язджае на рыбалку, а ў панядзелак з ёй збіраюцца расправіцца.

У той жа дзень Ганна з сястрой узялі дзяцей і пад выглядам прагулкі, без рэчаў, пайшлі на вакзал, селі ў цягнік і з’ехалі ў добраахвотную ссылку да Яна Скрыгана ў Сібір.

Жылі ў зямлянцы, вялі гаспадарку і думалі, што застануцца тут назаўжды. Даведаўшыся пра смерць Сталіна, ад шчырага гора плакалі ўсе, нават дзеці.

Але калі ў 1955 годзе Скрыгану прыйшоў ліст, у якім паведамлялася пра яго рэабілітацыю, ён адчуў, што не можа больш заставацца ў Сібіры ні аднаго дня, і ён вярнуўся ў Беларусь.

У снежні 1954 г. з Івана Аляксеевіча Скрыгана былі зняты ўсе абвінавачанні, ён быў поўнасцю рэабілітаваны і адноўлены ва ўсіх правах. Пасля вяртання ў Мінск пісьменнік актыўна ўключыўся ў літаратурную дзейнасць: працаваў рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР, літкансультантам Саюза пісьменнікаў, рэдактарам і намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Полымя». Як добры знаўца мовы быў запрошаны галоўным рэдактарам выдавецтва «Беларуская савецкая энцыклапедыя» П. Броўкам на пасаду загадчыка літаратурна-кантрольнай рэдакцыі (1967—1975). Працаваў адказным сакратаром камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (1975—1985). Але аб гэтай старонке жыцця Яна Скрыгана ведаюць усе…

….Мінулае не дае забыцца аб сабе. У 1963 годзе з Заходняй Германіі ў адрас Саюза пісьменнікаў прыйшоў ліст на імя Яна Скрыгана. У канверце быў здымак юнака з надпісам на абароце: “дарагому бацьку ад сына Усевалада”. Аказалася, першая жонка Скрыгана Галіна не загінула, іх з сынам падчас вайны сагналі ў Германію. Там і засталіся жыць. Завязалася перапіска... Але бацька так ніколі і не сустрэўся з сынам. Толькі ўнуку Яна Скрыгана, вядомаму гітарысту, якога таксама клічуць Ян Скрыган, удалося пазнаёміцца на свае вочы з германскім сваяком.

Ян Скрыган займаўся літаратурнай дзейнасцю да самай смерці. Не стала пісьменніка 18 верасня 1992 г., пахаваны ён на Паўночных могілках.

Іван Аляксеевіч умеў шчыра радавацца чужому творчаму поспеху, з радасцю падтрымліваў маладых. Калі бачыў нешта вартае – дапамагаў, спрыяў, чым мог. Яму прыносілі і дасылалі вельмі шмат рукапісаў літаратары-пачаткоўцы – студэнты, вясковыя настаўнікі… Часта ездзіў выступаць на раён, у школах, клубах. Адказваў на лісты, аналізаваў дасланыя творы, асаблівую ўвагу звяртаў на мову.

Вельмі радзеў аб роднай мове: “Праўда мовы — гэта і праўда вобраза, і праўда душы, і праўда атмасферы. І нам, пісьменнікам і журналістам, нельга не мець гэтага на першай сваёй увазе. У мове нават маленькае парушэнне можа пачапаць нашу веру ў праўду. Мы, напрыклад, прымушаем селяніна (у нашых творах) гаварыць: «Якая табе справа» або «Не твая справа», а селянін свае мовы тут не пазнае, бо ён гаворыць: «Што табе да таго», «Які табе клопат», «Не твой клопат» або нават «Не тваё дзела». І гэта натуральна, бо «справа» ў такім кантэксце ніколі народам не практыкуецца, а «дзела» бытуе вельмі шырока. Мне здаецца, што мы дарэмна баімося некаторых слоў, лічачы іх рускімі, як «свабодны», «давольны», «прамы», «пастаянна», «апаска». Якое б ні было іх паходжанне, але яны лёгка становяцца ў моўны рад, прыжываюцца самі, бо не супярэчаць законам мовы і яе сінтаксічным формам. А вось такія формы, як

«свецячыйся», не хочуць прыжывацца, бо ідуць уразрэз прыродзе мовы, жывая гаворка імі карыстацца не можа.

Наогул граматыка нарабіла цяпер столькі правіл і столькі выключэнняў з іх, што стала цяжка быць пісьменным чалавекам. Нездарма ж работнікі рэдакцый газет, часопісаў і выдавецтваў вечна поўзаюць па слоўніках і ўсякіх даведніках, каб упэўніцца — як правільна напісаць. І, можа, варта было б зноў вярнуцца да ўдасканалення нашага правапісу, каб зрабіць яго больш лёгкім і больш блізкім да прыроды і законаў самой мовы" (*Некалькі хвілін чужога жыцця. Мн., 1990.)*



Гаворку пра непаўторнага чалавека і пісьменніка хочацца закончыць яго ж словамі: «Як жа мала трэба мець вялікаму пісьменніку, каб да яго ўсе гарнуліся, – толькі сябе. І як многа – каб у ім кожны бачыў таксама сябе».

А нагаданы помнік нашаму суайчынніку у Эстоніі ўсталявалі ў 1998 годзе па ініцыятыве Іда-Вірускага Таварыства беларускай культуры пры падтрымцы Міністэрстваў культуры Эстоніі і Беларусі

***16 лістапада адзначым 115-годдзе з нагоды нараджэння пісьменніка.***



***26 лістапада юбілей найвялікшага класіка беларускай літаратуры УЛАДЗІМІРА СЯМЁНАВІЧА КАРАТКЕВІЧА.***

**Уладзіміру Сямёнавічу споўнілася б 90 гадоў…..**

Гэта з яго твораў беларусы чэрпалі звесткі аб гісторыі сваёй Краіны. Ды й ўвогуле адкрывалі для сябе гэту самую Краіну!

Караткевіч для Беларусі – тое ж, што Шолахаў для Расіі, Сянкевіч для Полшчы, Дзюма – для Францыі; а магчыма й больш!

Нездарма ж і сёння нашы дзеці прысвячаюць яму свае першыя паэтычныя радкі.

**Сардэчны сябар**

Уладзімір Караткевіч — сябар наш сардэчны:
Ён любіў сваю Радзіму, чалавецтва, Вечнасць,
Вандраваў па вёсках, рэках, па лясах, па замках
І збіраў сваё натхненне на жыцця напрамках.
Ён пісаў пра свет дзяцінства і юнацтва хвалі,
Пра каханне, мудрасць, шчасце, што заўжды шукалі,
Пра Радзіму і прыроду, пра жанчыну, маці,
Пра рашучасць, чалавечнасць, пра спагаду ў хаце…
Творы вабяць інтарэсам, людзям даспадобы:
Прачытаеш іх — і быццам курс прайшоў вучобы.
Хоць ужо паэт далёка, недзе з вечным плёсам,
Ды знаёмімся дагэтуль мы з ягоным лёсам.

Яна Валодзькіна, 10 гадоў

А вось як пішуць пра значнасць асобы паэта і пісьменніка нашы сучаснікі:

**Васіль Быкаў:** "Ён быў з пароды тых жыццялюбаў, якія ўсё радзей сустракаюцца ў нашым жыцці… У яго было вялікае чалавечае сэрца. Ягоная прыхільнасць да жыцця наогул не ведала межаў, і ў ёй заўжды было месца для незвычайнага… Ён быў вельмі шчодры ў жыцці і мудры ў літаратуры".

**Людміла Рублеўская:** "Дзякуючы Караткевічу я пачала пісаць вершы на беларускай мове — пакутліва ўспаміналіся, прыходзілі словы, нібы- та руйнавалася нейкая шкляная сцяна, якая аддзяляла мяне ад сапраўднага све- ту (беларусы ж існуюць у няправільным, штучна створаным свеце «Матрыцы»).

«Горкі рамантызм»... Гэтак калісьці я назвала для сябе атмасферу караткевічавых твораў. Радзіма, жанчына — Прыўкрасная Дама без жалю, дзеля якой варта гінуць, але не варта чакаць спа чування і славы. У герояў Караткевіча шмат ад экзістэнцыялісцкіх герояў Сартра. Змагацца да апошняга — проста праз суровае пачуццё доўгу, праз Фатум, які набывае рысы Беларусі... Ягоныя героі ніколі не верац, што каханая можа іх палюбіць. «Я варты толькі таго, каб біцца за Яе, прыпаўзці і памерці ля ейных ног...» — разважаюць паэты і князі ў ягоных раманах і аповесцях. Многія пісьменнікі, якія перажылі перабудову, інакш зірнулі на рэлігію і класавую

барацьбу. Упэўнена, што Караткевіч, які меў шляхецкія карані, таксама пазбавіўся б многіх акцэнтаў, што мусілі прысутнічаць у савецкага пісьменніка. Ён усё-ткі быў найперш беларускім, нацыянальным пісьменнікам. Рамантыкам. Таму яго і любім. І, ведаеце, у мяне ўсё-ткі ёсць трывалае адчуванне — што я з ім сустракалася. З маім Уладзімірам Караткевічам.”

**Дзяніс Марціновіч** адзначае: “ Караткевіч у асабістым жыцці быў не такім шчаслівым чалавекам, як нам падаецца. Цікава чытаць яго раманы, дзе апісваецца каханне… Аднак ён узяў шлюб толькі ў 40 гадоў. У яго асабістым жыцці былі велізарныя трагедыі. Ён збіраўся ажаніцца, але нявеста загінула ў аўтакатастрофе літаральна перад вяселлем.

Была другая гісторыя, калі ён меў універсітэцкае каханне, у Кіеве, але яны развіталіся. Праз пэўны час гэта жанчына сама напісала яму, прапанавала аднавіць стасункі. Караткевіч адчуў эйфарыю, шчасце, бо ўсе гады памятаў былую сяброўку. Але неўзабаве атрымаў ліст ад яе знаёмай, у якім паведамлялася, што яго каханая выйшла замуж за іншага.

У рамане «Леаніды не вернуцца да Зямлі» апісваецца каханне да Ніны Молевай — рэальнай жанчыны, якая жыве дагэтуль у Маскве. Яна была сапраўды ракавой прыгажуняй, таму Караткевіч перажываў супярэчлівыя пачуцці. «Яго вельмі натхнялі жанчыны, — адзначае Марціновіч. — Але ён не быў шчаслівым. Толькі калі пісьменнік нарэшце знайшоў жонку, усё змянілася. Аднак парадокс заключаецца ў тым, што яго найлепшыя тэксты прыпадаюць акурат на той час, калі ён быў нешчаслівы. Яго натхнялі душэўныя пакуты».

Але ж, на мой погляд, так было заўсёды. Прыгадаць хаця б каханне Анарэ дэ Бальзака да польскай графіні Эвеліны Ганскай. Менавіта немагчымасць быць з каханай прымусілі пісьменніка напісаць вялікую колькасць геніяльных твораў, якія потым аб’яднала адна назва “Чалавечая трагедыя”….
І, сапраўды, учытайцеся ў гэтыя караткевічскія радкі:

*Чамусьці сёння цішыня такая,*
*Што сесці хочацца і патужыць.*
*Самотна зорка над зямлёй згарае,*
*І ў гурбах ліпа з холаду дрыжыць.*
*І я усё - усё чамусьці забываю,*
*Што знік той дзень, загублены ў цішы,*
*Што час ляціць, што ты ужо не тая*
*І што даўно я знік з тваёй душы…*
*Дні прабягаюць, і гады сплываюць,*
*Хвіліны шчасця часам прамігцяць,*
*А боль жыве, і сэрцам адчуваю,*
*Што жыць заўсёды будзе, да канца.*
*І ўсё ж на досвітку, і ў час змяркання,*
*І ў ясны дзень і ў час, як спяць палі,*
*Я дзякую жыццю за цень кахання,*
*За тое, што жывеш ты на зямлі.*
*Сяджу ў пакоі каля цёплай грубы.*
*Шыпіць пласцінка. Ў сэрцы многа дум.*
*Кручу: "Над домам флюгер ёсць у любай".*
*І Шуберт падзяляе ціхі сум…*
*Я дзякую табе. Няхай чужая,*
*Няхай твой твар для іншага жыве,*
*Ты ёсць, ты недзе ёсць, і ты жывая,*
*Ты ходзіш веснім ранкам па траве!*
*Твае ў загары рукі бэз ламаюць.*
*Жыві і вечнай славай прамяней!*
*Рукой закрыўшы вочы, усміхаюся...*
*Ты ёсць на свеце. Досыць для мяне.*

Гэта – пра сапраўднае каханне, да болю, да слёз – да бясконцасці…..

Паважаныя суайчыннікі, каб зведаць сваю Беларусь ды й спазнаць сябе беларусам, чытайце Уладзіміра Караткевіча. Тым больш, як заўважыў В. Быкаў: “У яго ёсць чаму павучыцца”.

*Шэпчуць лісцем пажоўклым тополі,*
*Зоры робяць за кругам круг.*

*Я не бачыў цябе ніколі,*
*Мой маленькі нябесны друг.*




*Узыдзі, мая зорка срэбная,*
*Над абшарамі нашых бароў,*
*У людзей жа на сёмым небе*
*Не было ніколі сяброў.*

*Не да неба ляцела іх сэрца,*
*А да ніў сваёй стараны.*
*Ўсе яны зямныя да смерці,*
*Але ты хіба не зямны?*

*Тут прыпала табе нарадзіцца,*
*Тут звычайныя людзі зямлі*
*Разгадалі тваю таямніцу*
*І сусвету цябе аддалі.*

**“Быў. Ёсць. Буду”**, -так пра сябе мог сказаць толькі геній….

***І я на гэтых старонках хачу прызнацца ў каханні да Чалавека, Пісьменніка і Грамадзяніна – Уладзіміра Караткевіча….***



## 28 ноября отметим 140 – летие Александра Блока.

Александр Блок родился 28 ноября 1880-го года в Санкт-Петербурге. Прожил недолгую, но насыщенную жизнь, навсегда закрепив за собой славу гения и одного из самых ярких поэтов Серебряного Века. Его произведения до сих пор окутаны вниманием почитателей и критиков, то возносящих его творчество к небу, то обвиняя в сатанизме….

Его отец, Александр Блок — старший, был приват-доцентом кафедры государственного права Варшавского университета, а мать Александра — дочерью ректора Санкт-Петербургского университета Андрея Бекетова. Вскоре после рождения сына родители Блока расстались.

Первые стихи Александр начал сочинять, когда ему было всего 5 лет. Но первой серьезной пробой пера можно назвать небольшой сборник, созданный им в одиннадцатилетнем возрасте. Все свои стихи юный Блок посвятил матери.

Первые публикации А. Блока появились в 1903 г. в петербургском журнале «Новый путь» и, почти одновременно, в московском альманахе «Северные цветы».

Важным событием начала 1900-ых годов для Александра Александровича стала женитьба на Любови Менделеевой, приходившейся дочерью именитому отечественному ученому-химику Дмитрию Менделееву. Отношения между молодыми супругами были сложными и своеобразными, однако наполненными любовью и страстью. Любовь Дмитриевна стала источником вдохновения и прообразом ряда персонажей в произведениях поэта. Именно ее образ лег в основу «Стихов о Прекрасной Даме».

Особую роль для формирования мировоззрения Блока сыграли события революции 1905-1907 годов, обнажившие стихийную, катастрофическую природу бытия. В лирике этого времени становится ведущей тема "стихии" – образы метели, вьюги, мотивы народной вольницы, бродяжничества. Прекрасную Даму сменяют демонические Незнакомка, Снежная Маска, цыганка-раскольница Фаина.

Кстати, многим будет интересно узнать такой факт: в 1916 году писателя призвали на военную службу в Белоруссию.

Когда же в 1917 году произошла революция, Блок встретил ее в противоречивых чувствах, но от предложения эмигрировать отказался сразу.

Александр Блок много работает, пишет. В январе 1918 г. Блок испытывает небывалый творческий подъем и в едином порыве пишет поэму «Двенадцать», статью «Интеллигенция и Революция», стихотворение «Скифы» - произведения, которые славят “могучую музыку революции”.

Однако переоценка ценностей и, скорее всего, склонность к душевному расстройству, доставшаяся по наследству от отца, негативно сказались на здоровье поэта.

Три последних года Блок стихов не писал. «Заболел он лишь в марте 1921 года, – пишет К.И.Чуковский, – но начал умирать гораздо раньше, ещё в 1918 году… Он умер сейчас же после написания «Двенадцати» и «Скифов», потому что именно тогда с ним случилось такое, что, в сущности, равносильно смерти. Он онемел и оглох… Когда я спрашивал у него, почему он не пишет стихов, он постоянно отвечал одно и то же:

– Все звуки прекратились. Разве вы не слышите, что никаких звуков нет?

А вот ещё одно воспоминание - художника Юрия Анненкова: «В последний год его жизни разочарования Блока достигли крайних пределов. В разговорах со мной он не боялся своей искренности: – Я задыхаюсь, задыхаюсь, задыхаюсь! – повторял он, – и не я один: вы тоже! Мы задыхаемся, мы задыхаемся все! Мировая революция превращается в мировую грудную жабу!»

Поэтический дар покинул Блока. И он это понимал. Страшно - поэт без стихов, что ангел с отрубленными крыльями…

Последнее выступление Блока состоялось за два месяца до его смерти. Атмосфера в Большом театре была настолько мрачной и гнетущей, что один из зрителей вслух сравнил творческий вечер поэта с поминками.

…Это был вечер, посвященный Александру Сергеевичу Пушкину. Тогда поэт выступил со своей знаменитой речью «**О назначении поэта**». Он долго рассуждал и философствовал по теме, а закончил речь так: «**Поэт умирает, потому что дышать ему больше нечем; жизнь потеряла смысл».**

Умер Александр Александрович Блок 7 августа 1921 года, в 10 часов 30 минут утра.

По поэту плакали десятки, а может быть, сотни и тысячи почитателей его гения. «Реву…», – записал в дневнике 11 августа Корней Чуковский, узнавший от художника Добужинского о смерти Блока. 12 августа он продолжил запись о своём возвращении из Порхова в Петроград: «НИКОГДА В ЖИЗНИ (выделено Чуковским ) мне не было так грустно … Когда я выехал в поле, я не плакал о Блоке, но просто – всё вокруг плакало о нём».

Узнав о смерти Блока, Сергей Есенин метался по всей Москве, рыдал и, забегая на проводившиеся в то время литературные вечера, кричал: «Это вы, пролетарские поэты, виновны в смерти Блока!»

Анна Ахматова нарекла поэта **«трагическим тенором эпохи»**….

## Друзьям

**А. Блок**

*Друг другу мы тайно враждебны,*
*Завистливы, глухи, чужды,*
*А как бы и жить и работать,*
*Не зная извечной вражды!*
*Что делать! Ведь каждый старался*
*Свой собственный дом отравить,*
*Все стены пропитаны ядом,*
*И негде главы приклонить!*
*Что делать! Изверившись в счастье,*
*От смеху мы сходим с ума*

*И, пьяные, с улицы смотрим,*
*Как рушатся наши дома!*
*Предатели в жизни и дружбе,*
*Пустых расточители слов,*
*Что делать! Мы путь расчищаем*
*Для наших далеких сынов!*
*Когда под забором в крапиве*
*Несчастные кости сгниют,*
*Какой-нибудь поздний историк*
*Напишет внушительный труд...*
*Вот только замучит, проклятый,*
*Ни в чем не повинных ребят*
*Годами рожденья и смерти*
*И ворохом скверных цитат...*
*Печальная доля — так сложно,*
*Так трудно и празднично жить,*
*И стать достояньем доцента,*
*И критиков новых плодить...*
*Зарыться бы в свежем бурьяне,*
*Забыться бы сном навсегда!*
*Молчите, проклятые книги!*
*Я вас не писал никогда!*
*24 июля 1908*

За 13 лет до смерти было написано это стихотворение, но оказалось пророческим.... Откройте интернет, чтобы убедиться, как бездари глумятся над Поэтом...

И вот ещё что: самое известное стихотворение Блока "Ночь, улица, фонарь, аптека..." запечатлено на улице Лейдена в Нидерландах в виде памятника – написано на стене одного из домов в рамках всемирного проекта «Wall poems».




***Возьмите в руки томик Блока и откройте для себя Поэзию….***

В статье использованы материалы Интернет-ресурса: https://stihi.ru/2010/10/08/6184



***В этот же день отметим 105-летие со дня рождения Константина Симонова***

Константин Михайлович Симонов (Кирилл Михайлович Симонов) – известный советский писатель, общественный деятель, военный корреспондент, лауреат Ленинской и Сталинских премий, Герой Социалистического Труда.

Родился Константин 28 ноября 1915 года в Петрограде. Воспитывался отчимом, который был военным специалистом и преподавал в военных училищах.

Константин Михайлович Симонов мало что знал о родном отце, генерал-майоре царской армии. Долгое время принято было считать,

что его отец "пропал без вести" в 1916 г. во время Первой мировой или Гражданской войн. Родной отец не был упомянут ни разу ни в его стихах, ни даже в написанной "в стол" и увидевшей свет лишь в годы перестройки после смерти автора книге "Глазами человека моего поколения". И это в некоторой степени понятно и оправдано, ведь для классика советской литературы "неправильное" происхождение было потенциально опасным и посему исключавшим отсылки к отцовской биографии.

Константин Симонов был человеком своей эпохи – времени, в котором он жил и о котором рассказывал. Его лирическая поэзия, проза и драматургия заняли особое место в литературе XX века. Главной темой его творчества была война. Военный корреспондент Симонов прошел Великую Отечественную от первых до последних дней. И первым рассказал "неудобную" правду о самых страшных днях войны. Его репортажей с фронта ждали в тылу, стихи читали на передовой между боями, записывали и переписывали у друзей.

В 1940 году была написана первая пьеса Симонова «История одной любви», а в 1941 году вторая – «Парень из нашего города».

Это творчество. Но мне хочется рассказать вам историю одной любви.

*Валентина Серова и Константин Симонов….* Их имена навсегда соединили строки «Жди меня и я вернусь...».

В 1941 году, когда это стихотворение было написано, Константин Симонов сопроводил его посвящением: «Валентине Васильевне Серовой». Актрисе на тот момент было всего-то 22 года, но она к тому времени уже вдова….

Симонов осаждает известную актрису, словно крепость. Переломным становится 1941 год и именно стихотворение Симонова «Жди меня и я вернусь...».

Скромную свадьбу пара играет в 1943 году в Москве в момент, когда Симонов вырывается с передовой, где он служит фронтовым корреспондентом. В том же году на экраны выходит фильм «Жди меня» с Валентиной Серовой по мотивам прославленного стихотворения.

Однако пройдёт время, и Симонов сократит это посвящение до коротких инициалов «В. С.», а в остальных стихотворениях, посвящённых Серовой и принесших ему славу, и вовсе уберёт упоминание её имени: даже с лирического сборника «С тобой и без тебя», написанного в пору, когда он страстно добивался руки актрисы. Сам он говорил, что о его чувствах к Серовой всё сказано в стихах. В стихах, которыми зачитывалась вся огромная страна, которые переписывали от руки, запоминали наизусть. Стихах, которые его, начинающего писателя и фронтового корреспондента, прославили.

Однако последние строки Симонова в адрес Валентины Серовой будут совсем другими: «Я не могу писать тебе стихов ни той, что ты была, ни той, что стала... Я просто разлюбил тебя...» На похоронах Серовой его не будет, но он пришлёт к гробу 58 розовых роз — по количеству прожитых актрисой лет.

Константин Симонов после разрыва с Серовой на своих творческих вечерах избегал читать стихотворение «Жди меня...». Но читать приходилось, потому что из зала шли десятки просьб. Что он думал и чувствовал в этот момент, мы уже никогда не узнаем. Только его слова, сказанные перед смертью дочери: «...То, что было у меня с твоей матерью, было самым большим счастьем в моей жизни... И самым большим горем».

Константин Симонов прославил подвиг защитников белорусского города Могилева в июле 1941 года. Он побывал в осажденном фашистами городе, посетил передний край обороны на Буйничском поле, где были подбиты 39 фашистских танков и бронемашин. Здесь он встретился с особо отличившимися в этом бою воинами-защитниками, в числе которых полковник Семен Кутепов, ставший прообразом генерала Серпилина в эпопее «Живые и мёртвые». О героях этого сражения военкор поведал на страницах газеты "Известия".

Позже писатель не раз возвращался к обороне Могилева, часто приезжал в областной центр, бывал на местах былых сражений, встречался с их участниками. Характеры и судьбы многих из них в той или иной степени получили отражение в его романах. Согласно завещанию прах Константина Симонова развеян над Буйничским полем под Могилевом

Литературное наследие Симонова велико. Он автор сценариев, очерков и многочисленных стихотворений.

Однако самое главное стихотворение, принесшее Симонову известность, — это «Жди меня». Именно оно стало настоящей поэтической молитвой, гимном верности и ожидания в годы войны.

Давайте прочтём бессмертные строки, пережившие свою любовь….

***Жди меня***

*Жди меня, и я вернусь.*
*Только очень жди,*
*Жди, когда наводят грусть*
*Желтые дожди,*
*Жди, когда снега метут,*
*Жди, когда жара,*
*Жди, когда других не ждут,*
*Позабыв вчера.*
*Жди, когда из дальних мест*
*Писем не придет,*
*Жди, когда уж надоест*
*Всем, кто вместе ждет.*

*Жди меня, и я вернусь,*
*Не желай добра*
*Всем, кто знает наизусть,*
*Что забыть пора.*
*Пусть поверят сын и мать*
*В то, что нет меня,*
*Пусть друзья устанут ждать,*
*Сядут у огня,*
*Выпьют горькое вино*
*На помин души...*
*Жди. И с ними заодно*
*Выпить не спеши.*

*Жди меня, и я вернусь,*
*Всем смертям назло.*
*Кто не ждал меня, тот пусть*
*Скажет: — Повезло.*
*Не понять не ждавшим им,*
*Как среди огня*
*Ожиданием своим*
*Ты спасла меня.*
*Как я выжил, будем знать*
*Только мы с тобой, —*
*Просто ты умела ждать,*
*Как никто другой.*

***Вось такі ён – літаратурны каляндар лістапада.***
***Чытайце добрыя кнігі, сябры мае!***

***У якасці асобы старога Архіварыуса з вамі гартала старонкі літаратурнага календара Ждан Н. Ф.***